**В. І. Саітава,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-*
*інфармацыйнай дзейнасці*

# ЗАСВАЕННЕ ПАНЯЦІЙНАГА АПАРАТУ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ Ў ПРАЦЭСЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. ТЭОРЫЯ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Засваенне паняццяў і ўвядзенне іх у прафесійную лексіку студэнта, якая толькі пачынае ў іх фарміравацца, складаная дыдактычная задача. У педагогіцы адзначаецца важнасць фарміравання ў студэнтаў кампетэнцыі працы з паняційным апаратам вучэбнай дысцыпліны. Падкрэсліваецца, што такая кампетэнцыя дазваляе студэнту «бачыць» вучэбную дысцыпліну сістэмна, аналізаваць яе структурныя кампаненты, усталёўваць сувязі паміж імі [1, с. 38]. Дасягненне гэтай кампетэнцыі фактычна немагчымае без самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне.

Вучэбная дысцыпліна «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» займае важнае месца ў фарміраванні прафесійных ведаў і мыслення будучага спецыяліста ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Прадметам гэтай дысцыпліны з’яўляюцца заканамернасці развіцця і функцыянавання, асноўныя прынцыпы, структура, стан і праблемы ўдасканалення ўсіх відаў бібліяграфічнай дзейнасці. Тэарэтычны характар дысцыпліны абумоўлівае неабходнасць засваення студэнтамі паняційнага апарату бібліяграфазнаўства. Сістэма тэрмінаў тэорыі бібліяграфіі ўяўляе арганізаваную сукупнасць паняццяў і іх азначэнняў, з дапамогай якой выконваецца апісанне і індэнтыфікацыя сутнасных аб’ектаў бібліяграфіі, яе суб’ектаў, працэсаў, ствараемай прадукцыі. У сярэдзіне 2000-х гг. колькасць тэрмінаў бібліяграфазнаўства перавышала за 500. У межах вучэбнай дысцыпліны вывучаецца частка актуальных тэрмінаў – каля 130. Яны адлюстраваны ў розных крыніцах, асноўнай з іх з’яўляюцца айчынныя вучэбныя выданні. Гэта «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» – два вучэбных дапаможнікі і адзін падручнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, напісаныя Т. В. Кузьмініч [2; 3]. У вучэбных выданнях вызначана, што

студэнты павінны ведаць і ўмець карыстацца асноўнымі паняццямі бібліяграфазнаўства, авалодваць навыкамі вядзення дзелавых, асобасных і міжасобасных зносін на прафесійнай мове [3, с. 7–8]. У гэтых выданнях маецца «Слоўнік асноўных тэрмінаў», прыведзены схемы і табліцы, «якія дазваляюць больш выразна паказаць сувязі тэарэтычных абагульненняў і даных практычнай дзейнасці» [3, с. 9]. Для вывучэння тэорыі бібліяграфіі і выканання СРС выкарыстоўваюцца СТБ ГОСТ 7.0-2004 Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія, слоўнікі, энцыклапедыі, прафесійная літаратура, асабліва публікацыі з расійскіх і беларускіх прафесійных перыядычных выданняў.

Паняццям тэорыі бібліяграфіі ўласцівы высокі ўзровень абагульнення, абстрактнасць, але іх змест трэба ведаць, імі трэба мысліць. Ключавымі паняццямі з’яўляюцца тэрміны «бібліяграфія», «бібліяграфічная інфармацыя/веды», «бібліяграфічная дзейнасць», «бібліяграфічны дапаможнік» (рэсурс, прадукт), «бібліяграфазнаўства». Менавіта яны выражаюць сутнасць і спецыфіку такой грамадскай з’явы, як бібліяграфія. Яны з’яўляюцца вытворнымі для дзясяткаў іншых паняццяў і звязаных словазлучэнняў і шырока выкарыстоўваюцца ў прафесійнай лексіцы. Ключавыя і вытворныя паняцці ў аспектах зместу, аб’ёму і ўзаемасувязяў разглядаюцца ў адпаведных тэмах на аўдыторных занятках. Паслядоўнасць іх прадстаўлення адбываецца ў парадку, вызначаным вучэбна-метадычнымі матэрыяламі.

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне вядзецца рэгулярна, ажыццяўляецца ў працэсе лекцый, семінараў, практычных заняткаў і па-за межамі аўдыторных заняткаў. Заданне па СРС і яго тлумачэнне даецца на аўдыторных занятках, а змест прадстаўлены ў электронным вучэбна-метадычным комплексе «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя». У ходзе рэалізацыі СРС выкарыстоўваюцца асобасна-арыентаваныя, інтэрактыўныя, гульнёвыя і іншыя педагагічныя тэхналогіі. Самастойныя работы, якія выконваюць студэнты, могуць быць аднесены да работ рэпрадукцыйнага, кагнітыўна-пошукавага і кагнітыўна-крытычнага характару.

Для запамінання новых тэрмінаў неабходна замацаваць сувязі паміж двума асацыяцымі: тэрмінам і дэфініцыяй. Каб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягнуць трывалага запамінання, разумення зместу паняцця, прапануюцца трэніровачныя тэставыя заданні, у якіх тэрмін выкарыстоўваецца ў розных кантэкстах. Пісьмовыя бліц-тэсты праводзяцца падчас аўдыторных заняткаў, іх праверка дапамагае выявіць узровень засваення лекцыйнага матэрыялу, назапашванне студэнтамі прафесійнай лексікі. Па кожнай тэме вучэбнай дысцыпліны складзена па 6 варыянтаў тэстаў living рознай ступені складанасці. Калі ў бліц-тэстах пераважае рэалізацыя рэпрадуктыўнага метаду арганізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, то іншыя заданні, у т. л. падрыхтоўка да семінарскіх і практычных заняткаў, праца над курсавымі работамі патрабуюць большых інтэлектуальных намаганняў з боку студэнтаў і выяўляюць дамінаванне элементаў кагнітыўна-пошукавай і кагнітыўна-крытычнай дзейнасці ў СРС. Гэта датычыцца такіх заданняў па засваенні паняццяў і адпаведных форм кантролю, як падрыхтоўка эсэ, колаў Эйлера, складанне красворда, электронных прэзентацый, удзел у індывідуальных і групавых гутарках і інш. Змест і формы кантролю СРС паступова змяняюцца.

Выкарыстанне кагнітыўна-пошукавага і кагнітыўна-крытычнага метаду магчыма праілюстраваць пры арганізацыі СРС па засваенні тэрміна «бібліяграфія». На лекцыі па тэме «Бібліяграфія як грамадская з'ява» студэнты атрымліваюць заданне на падрыхтоўку эсэ па пытанні параўнання дэфініцыі «бібліяграфія», якая адлюстравана ў сучасных нарматыўных, вучэбных і даведачных выданнях, як беларускіх і расійскіх, так і заходне-еўрапейскіх і паўночна-амерыканскіх. Па-за аўдыторна студэнты выконваюць аналіз і параўнанне дэфініцый і прадстаўляюць пісьмовую работу, у якой разам з выяўленымі вызначэннямі гэтага тэрміну выказваюцца ўласныя меркаванні адносна яго зместу і аб'ёму. Асобныя студэнты могуць абшырна і лагічна патлумачыць выбраныя дэфініцыі, але ў многіх аргументацыя з'яўляецца павярхоўнай, часткова адпавядаючай сутнасці паняцця. Тым не менш, студэнты спрабуюць даць самастойную ацэнку ключавому паняццю тэорыі бібліяграфіі, развіваюць свае крытычнае мысленне. Асобныя эсэ абмяркоўваюцца на семінарскіх занятках, а аўтарам лепшых работ прапанавана прыняць удзел у навуковай студэнцкай канферэнцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэмы аўдыторных заняткаў, прысвечаныя бібліяграфічнай прадукцыі, такія як «Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў)», «Віды бібліяграфічных дапаможнікаў» даволі складаныя для студэнтаў. Мэтавая накіраванасць аўдыторных заняткаў і СРС па гэтых тэмах звязана з неабходнасцю засваення студэнтамі значнага пласта тэрміналогіі з сучаснай бібліяграфічнай практыкай. Упершыню студэнты авалодваюць класіфікацыяй бібліяграфічнай прадукцыі, вучацца вызначаць асаблівасці асобных відаў і жанраў бібліяграфічных рэсурсаў. Часткова гэтыя тэмы выконваюцца студэнтамі па-за аўдыторна (у працяг практычных работ) і работа завяршаецца правядзеннем індывідуальных гутарак са студэнтамі, у ходзе якіх тлумачацца няправільныя падыходы да вызначэння відавых і іншых прымет бібліяграфічных рэсурсаў, памылкі ва ўжыванні адпаведнай тэрміналогіі. Для кантролю самастойнай работы па гэтых тэмах выкарыстоўваецца таксама тэст і колы Эйлера. Колы Эйлера, як геаметрычная схема, візуалізуюць адносіны паміж мноствам і яго часткай, дапамагаюць знаходзіць і наглядна паказваць лагічныя сувязі паміж паняццямі, якія адпавядаюць разнастайнасці сучасных бібліяграфічных рэсурсаў. Кожны студэнт атрымлівае індывідуальнае заданне (5 тэрмінаў), сярод іх – паняцце, абагульняючае мноства, астатнія з'яўляюцца яго часткамі і часткамі частак. Выконваючы гэту работу, студэнты знаёмяцца з метадам Эйлера, больш глыбока асэнсоўваюць змест паняццяў і з дапамогай колаў паказваюць суадносіны паміж імі. Па выніках выканання і ў мэтах карэкціроўкі з кожным студэнтам праводзіцца індывідуальнае суразмоў'е. Амаль усе студэнты правільна вызначаюць абагульняючае паняцце і часта блытаюцца пры суаднясенні частак паміж сабой (звыш 90 %). Элемент даследавання паняццяў, іх звязвання ці раздзялення і неабходнасць рабіць лагічныя вывады з'яўляюцца складанымі для многіх студэнтаў.

Засваенне прафесійнай лексікі падчас семінарскіх заняткаў адбываецца ў ходзе разважанняў і выказванняў студэнтамі сваіх меркаванняў. Для гэтага прызнаны розныя віды семінараў: круглы стол, «мазгавы штурм» і інш. Напрыклад, як семінар-дыскусія праходзіць семінар па тэме «Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе», на якім выдзеленыя каманды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адстойваюць пэўную бібліяграфазнаўчую канцэпцыю. Упор робіцца на асаблівасці вызначэння галоўных паняццяў у той ці іншай канцэпцыі, на выяўленне асаблівасцей зместу канцэптуальнага падыходу. Імітацыя дыскусій не заўсёды сведчыць пра глыбокае разуменне і засваенне матэрыялу, але часам тлумачэнні паняццяў даюцца спосабамі і аргументамі, якія бліжэй да мыслення студэнтаў.

Для замацавання паняццяў па розных раздзелах вучэбнай дысцыпліны ў па-за аўдыторны час прапануецца падрыхтоўка невялікага красворда. Яго складанне засяроджвае ўвагу студэнтаў на вызначэнні паняццяў і адпаведных тэрмінах.

Для паспяховай СРС студэнтам аказваецца кансультацыйная дапамога, у т. л. індывідуальная, і з выкарыстаннем дыстанцыйных форм навучання.

Кантроль вынікаў самастойнай работы, выкананай аўдыторна і па-за аўдыторыяй вядзецца пераважна з прымяненнем дыферэнцыраванай ацэнкі як сродка матывацыі студэнтаў. Вопыт падказвае, што выкладчыку пры разглядзе кожнай работы студэнта трэба даць не проста бальную, але і вербальную ацэнку. Падчас выніковай атэстацыі на экзамене па вучэбнай дысцыпліне паспяховая СРС студэнта ўлічваецца пры вызначэнні ацэнкі.

Праблемамі, якія перашкаджаюць паспяховаму засваенню паняційнага апарату тэорыі бібліяграфіі асобнымі студэнтамі, з'яўляюцца не толькі яго навізна і пэўная складанасць, але ў большай ступені адсутнасць прафесійнай матывацыі, а таксама недахопы самаменеджменту студэнта. Далейшае развіццё самастойнай работы над паняццямі па вучэбнай дысцыпліне бачыцца ва ўзмацненні візуалізацыі і выкарыстанні электронных тэхналогій падчас аўдыторных заняткаў, у пошуку новых форм СРС і сродкаў матывацыі студэнтаў, у пашырэнні кола новых актуальных тэрмінаў, якія адлюстроўваюць бібліяграфічныя з'явы сучаснага лічбавага свету.

---

1. *Воронова, Е. Н.* Изучение уровня сформированности понятийного аппарата специальности у студентов технического вуза / Е. Н. Воронова // Качество подготовки специалистов в техническом университете: проблемы, перспективы, инновационные подходы : материалы IV Междунар. науч.-метод. конф., 15–16 нояб. 2018 г., Могилев / Могилевский

государственный университет продовольствия ; редкол.: А. С. Носиков (отв. ред.) [и др.]. – Могилев : МГУП, 2018. – 376 с.
2. *Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с.
3. *Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 204 с.
4. *Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : падручнік / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : РІВШ, 2018. – 216 с.

**Н. В. Самерсова**,
*кандидат педагогических наук, доцент,*
*профессор кафедры педагогики*
*социокультурной деятельности*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИННОВАЦИОННЫХ МЕТОДОВ ОБУЧЕНИЯ В ФОРМИРОВАНИИ ЭКОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ КОМПЕТЕНТНОСТИ СПЕЦИАЛИСТОВ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ СФЕРЫ

Динамичное развитие социокультурной сферы сегодня диктует необходимость того, чтобы при подготовке будущих специалистов социально-культурной деятельности вводить и оценивать такие показатели, как эколого-педагогическая компетентность и готовность к деятельности по формированию экологической культуры личности. Вместе с тем на практике имеет место противоречие между возрастанием потребности в квалифицированных специалистах в области эколого-культурной деятельности и уровнем их подготовки, эколого-педагогической компетентности.

Эколого-педагогическая компетентность выступает интегративной личностно-профессиональной характеристикой педагога социокультурной сферы, требующей многоаспектного подхода к ее изучению. Как система она включает нравственно-гуманистическую направленность, мотивы, цели, ценностные ориентации, требует совокупности знаний, умений, форм и способов их использования в постоянно меняющейся обстановке и передачи в будущем этих умений различным категориям населения, с которыми работает специалист СКД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ